*Уладзімір Караленак*

# Нясвіжскі палац, ардынацыя і Радзівілы ў эга-дакументах XIX–XX стст.

У сярэдзіне 1950-х гг. галандскі гісторык Ж. Прэсер прапанаваў выкарыстоўваць неалагізм «эга-дакументы», які дазволіў бы аб'яднаць самыя розныя тэксты: аўтабіяграфіі, мемуары, дзённікі, прыватнае ліставанне, журналы падарожжаў і інш.[1] З тых часоў было прапанавана яшчэ каля дзясятка абазначэнняў дадзенага спісу крыніц, але, нягледзячы на іх існаванне, неабходна падкрэсліць, што менавіта тэрмін «эга-дакументы» атрымаў найбольшае распаўсюджанне, і ў тым ліку актыўна выкарыстоўваецца ў апошнія гады беларускімі даследчыкамі[2,3,4].

У мемуарах і аўтабіяграфіях зафіксаваны ўражанні асоб, якія былі ўдзельнікамі або сучаснікамі пэўных падзей, і таму гэта надзвычай суб›ектыўныя сведчанні мінулага, створаныя пад уплывам сацыяльна-палітычнай атмасферы часу напісання. У адрозненні ад мемуараў і аўтабіяграфій, дзённікі і журналы падарожжаў складаюцца з рэгулярных запісаў, якія адлюстроўваюць бягучыя ўражанні, назіранні, думкі і таму

---

[1] Зарецкий, Ю. П. Новые подходы к изучению свидетельств о себе в европейских исследованиях последних лет // Автор и биография, письмо и чтение. Сборник докладов / Рук.: Ю. П. Зарецкий; под общ. ред.: Ю. П. Зарецкий; науч. ред.: Ю. П. Зарецкий. М. : Издательский дом НИУ ВШЭ, 2013. С. 24–41.

[2] Ад цыдулкі да мемуараў: эга-дакументы як крыніца ўзнаўлення асобы (з вопыту арганізацыі і правядзення конкурсу літаратурна-гістарычнага эсэ «Вацлаў Ластоўскі і Лаздзіну Пяледа: крыўскія міфы і гістарычныя лёсы» // Трансформация жанров в литературно-художественной критике. Вып. 4: Сб. научных трудов под ред. Л. П. Саенковой. – Минск, 2013. – 158 с. – С. 36–41.

[3] Савич, А. А. Женский фактор в историографии истории Западной Беларуси 1921–1939 гг. (вторая половина 1950–1980) // Роль женщины в развитии современной науки и образования: сборник материалов Международной научно-практической конференции, 17–18 мая 2016 г., Минск / БГУ ; редкол.: И. В. Казакова, А. В. Бутина, И. В. Олюнина. – Минск : БГУ, 2016. – С. 301–315.

[4] Лісейчыкаў, Д. В., Бобер, І. М. «Варуючы и милуючы малъжонку мою законную веньчалъную...»: жыццё і смерць мітрапаліта-«дваяжэнца» Анісіфара Дзевачкі // Беларускі гістарычны часопіс. – № 5. – 2018. – С. 11–23.

больш дакладна перадаюць настроі грамадскага жыцця і падрабязныя дэталі эпохі. Што датычыцца прыватнага ліставання, то тут знаходзіцца інфармацыя аб найбольш значных падзеях асабістага і грамадскага жыцця, што дае мажлівасць вызначэння пэўнай шкалы каштоўнасцяў адрасанта.

Сярод найбольш вядомых мемуараў Радзівілаў XIX – пачатку XX стст. вылучаюцца ўспаміны Луізы Радзівіл з Гогенцолернаў (1770–1836)[1], Марыі Дароты Радзівіл з Кастэлянаў (1840–1915)[2], Эло Радзівіл (1850–1931)[3], Кацярыны Радзівіл з Ржэвускіх (1858–1941)[4], Эльжбеты (1861–1950)[5] і Марыі Малгажаты (1875–1962) Патоцкіх з Радзівілаў[6], Крыштафа Мікалая (1898–1986)[7] і Міхаіла Радзівілаў (1907–1974)[8]. Пры гэтым трэба адзначыць, што мемуары двух апошніх ахопліваюць толькі XX ст. Такім чынам, захавальнікамі родавай памяці на працягу XIX ст. збольшага выступалі жанчыны, успаміны якіх даюць арыгінальны погляд на працэсы, што адбываліся ў сям'і. Акрамя гісторыі радзівілаўскага дому і псіхалагічных партрэтаў сваіх блізкіх  і сучаснікаў, аўтары мемуараў асвятляюць пытанні нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, эканамічнай, гаспадарчай і палітыка-дыпламатычнай дзейнасці арыстакратыі. Асобнай тэмай з'яўляецца праца Радзівілаў з гісторыяй памяці: акрамя выдання мемуараў, яны заключалі дамовы з гісторыкамі аб стварэнні сямейных хронік і гістарычных нарысаў, што пацвярджаецца дакументамі, якія

---

[1] Radziwiłł, L. Pamiętniki ks. Radziwiłłówej (Ludwiki księżnej pruskiej). Czterdzieści pięc lat mojego życia (1770 do 1815). Przeklad z francuskiego. – Warszawa, 1911. – 159 s.

[2] Radziwiłł, M. Souvenirs de la princesse Antoine Radziwill (née Castellane) : 1840–1873. Paris: Plon,1931. – 310 s.

[3] Radziwiłł, E. Fala przeszłości. Pamiętnik księżnej Elżbety Radziwiłłówny. – Ostrów Wielkopolski: Republika Ostrowska, 2014. – 77 s.

[4] Radziwill, C. My recollections. – London: Isbister, 1904. – 346 s.

[5] Wspomnienia od roku 1885 do roku 1915 przez Elżbietę z Radziwiłłów Romanową Potocką opisany // Łańcut maszynopis, II-2/64.

[6] Potocka, M. (Maria Małgorzata z Radziwiłłów-Franciszkowa Potocka). Z moich wspomnień (pamiętnik). – London: Veritas, 1983. – 510 s.

[7] Radziwiłł, K.-M. Pamiętniki. Od feudalizmu do socjalizmu bezpośrednio. – Warszawa: Wiedza Powszechna, 2000. – 368 s.

[8] Radziwill, M. One of the Radziwills. – New Jork, 1971. – 221 p.

знаходзяцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску[1], а часам і самі стваралі такія творы[2].

У радзівілаўскіх прыватных лістах добра прасочваюцца такія аспекты сямейнага жыцця, як выхаванне дзяцей, адносіны паміж мужам і жонкай, размеркаванне сямейных абавязкаў і роляў. У Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве захоўваецца больш за 500 лістоў на польскай і нямецкай мовах ад Юрыя Фрыдэрыка Радзівіла (1860–1914) да бацькі, нясвіжскага і клецкага ардыната, Антонія Вільгельма (1833–1904). Яны прасякнуты любоўю сына да бацькоў і разам з тым невыноснай тугой з-за таго, што маленькі хлопчык разам са сваёй малодшай сястрой Эльжбетай (1861–1950) практычна не бачыць бацьку і матулю. Тут мы размясцім невялікія вытрымкі з некаторых лістоў 1867–1870 гг., якія апавядаюць пра выхаванне і адукацыю дзяцей нясвіжскага ардыната.

*«Берлін, 12 чэрвеня 1867 г.*

*...Вярнуўся рана з парка, дзе з Бэткай гулялі і палівалі кветкі. Паветра цудоўнае, але вецер халодны.*

*...У мінулы чацвер пачаў вучыцца плаваць, але надвор'е сапсавалася і стала так холадна, што вымушаны быў зрабіць перапынак у занятках».*

*«Рашкот, 28 ліпеня 1868 г.*

*Віншую каханага тату з Днём нараджэння і жадаю найлепшага здароўя і шчаслівага падарожжа. Было б нам вельмі прыемна, калі б Дзень нараджэння каханага таты разам з ім правесці маглі, тым больш што ўжо тры гады не маем такога шчасця: апошні раз святкавалі гэты дзень разам з татай у Радзівілімонтах.*

*Пасля растання з каханым татам паехалі мы ў Парыж. Было вельмі спякотна, і Бэтка найбольш пакутвала ад гэтага, беспераnынна махаючы веерам. Мне было лягчэй, бо я быў захоплены чытаннем. А шостай паветра пахаладала і да Бэткі вясёлы настрой вярнуўся і мы пачалі па вагоне скакаць і гуляць.Так даехалі мы да Парыжа».*

*«Рашкот, 28 жніўня 1868 г.*

---

[1] НГАБ. – Ф. 694. Воп. 1. Спр. 160. – Дамова паміж кн. Браніцкай-Радзівіл і гісторыкам Якубоўскім аб напісанні апошнім гістарычнай манаграфіі аб Нясвіжы. 1913 г.

[2] Radziwiłł, A.-F. Losy najstarszej linji xiążat Radziwiłłów. – Wilno, 1926. – 11 s.

*Каханы тата, падняўся зараз да нашага пакою, каб да каханага таты ліст напісаць. Перш найперш хацеў б распавесці, што ўбачыў акеан!»*

*«Берлін, 18 снежня 1870 г.*

*Дзякую, каханы тата, за твой ліст і прабач, што раней не адпісаўся, бо маю зараз шмат працы: найбольш па вывучэнню лацінскай мовы, гісторыі і арыфметыцы. На першым прадмеце займаюся перакладам Карнэлія Нэпота і de viris illustribus urbis Romae, на другім вывучаю Пунічныя войны. Падчас навучэння гісторыі дрэнна ў мяне атрымліваецца запамінаць даты. У трэцім прэдмеце зараз у мяне адніманне дробаў»*[1].

Сярод цікавых традыцый, якія існавалі ў Радзівілаў, трэба адзначыць напісанне лістоў з вершамі-віншаваннямі, якія дзеці адрасавалі бацькам. У сакрэтным сямейным архіве Радзівілаў, які зараз знаходзіцца ў фондах Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве, можна бачыць вершы, якія пісаў у маленстве брат Юрыя Станіслаў Вільгельм Радзівіл (1880–1920) да бацькі Антонія Вільгельма, сярод якіх верш ад 31 ліпеня 1887 г.

*«Каханы Тата!*
*Не толькі сёння, але і назаўсёды*
*Хай шчасціць і здароўя без нядоляў*
*І ласка Божая няхай з табою будзе*
*У дому, падарожжах і ў людзях!*
*А да таго твой сын малодшы ад сэрца прамаўляе,*
*Што на шляху да праўды і славы даўняй*
*Прамень яго заззяе […]» (пераклад з польскай аўтара)*[2]

Увогуле, цікавасць да паэзіі ў адзначаны час выказвалі многія прадстаўнікі роду, а кніга вершаў на нямецкай мове Леанціны Радзівіл з Клары-Алдрынгенаў (1811–1890) была нават выдадзена за кошт сям'і на пачатку XX ст[3].

Большасць радзівілаўскіх лістоў XIX ст. знаходзіцца ў архівах у рукапісным выглядзе, але частка з іх усё ж такі была апрацавана і выдадзена ў выглядзе кніг. Перш за ўсё гаворка ідзе пра лісты дачкі нясвіжскага

[1] Archiwum Główne Akt Dawnych (dalej jako AGAD), AR– Dział XIII: Archiwum familijne sekretne, T.8, pl. 10.

[2] AGAD, AR– Dział XIII: Archiwum familijne sekretne, T 9/II, pl. 24.

[3] Radziwill, L. Gedichte. - Miejsce nieznane : Selbstverlag der Familie. – 109 s.

ардыната Антонія Генрыха Радзівіла (1775–1833) Элізы (1803–1834), каханне якой да прускага прынца Вільгельма шмат у чым нагадвала гісторыю XVI ст., калі прадстаўніца роду Барбара Радзівіл здолела стаць каралевай[1]. Нягледзячы на тое што шлюб Элізы і Вільгельма так і не адбыўся, гэта гісторыя прыцягнула ўвагу грамадскасці і стала асновай для стварэння цэлага шэрагу мастацкіх твораў і фільмаў. У 1930-я гг. былі выдадзены ў чатырох тамах лісты Марыі Дароты Радзівіл з Кастэлянаў да італьянскага генерала М. дэ Рабеляна, а таксама – кніга яе лістоў да двара апошняга нямецкага імператара Вільгельма II[2,3].

Дагэтуль некранутай тэмай з'яўляецца адпачынак арыстакратыі XIX ст., адметнасцю якога былі частыя падарожжы. У прыватнасці Радзівілы падарожнічалі не толькі па Еўропе, а таксама часта наведвалі Афрыку і Амерыку. Пры гэтым гаворка ідзе не толькі пра турыстычныя і паляўнічыя паездкі, але і падарожжы, у выніку якіх заключаліся трансатлантычныя шлюбы паміж прадстаўнікамі старой еўрапейскай арыстакратыі і маладой амерыканскай буржуазіі. Прынамсі двое Радзівілаў адзначыліся такімі шлюбамі. Прадстаўнік паланечскай лініі князь Альберт Станіслаў Радзівіл (1868–1927) у 1896 г. у Нью-Ёрку ажаніўся з мексіканкай Прудэнцыянай Мільма, а будучы нясвіжскі ардынат князь Антоній Альбрэхт Радзівіл (1885–1935) у 1910 г. ажаніўся ў Лондане з амерыканкай Дораці Дзікан. Пры гэтым, на жаль, абодва трансатлантычныя саюзы не сталі шчаслівымі. Першы аказаўся бяздзетным, а другі праз нейкі час скончыўся гучным разводам. Абодва шлюбы выпалі на віхурлівы перыяд рэвалюцый і войн. У 1910 г. у Мексіцы пачалася рэвалюцыя. Альберт Станіслаў Радзівіл цудам ўратаваўся з ахопленай грамадзянскай вайной краіны, страціўшы пры гэтым агромністы маёнтак у Мантэрэі, і разам з жонкай прыехаў у Паланэчку (суч. Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці), дзе прыняў па спадчыне палац. Паводле ўспамінаў Крыштафа Мікалая Радзівіла, ён за кароткі час аднавіў занядбаную сядзібу, паводле

[1] Radziwill, E. Eine Leben in Liebe u. Leid : Unveröffentl. Briefe d. J. 1820–1834 / Elisa Radziwill. hrsg. von Bruno Hennig. – Berlin : E. S. Mittler & Sohn, 1922.

[2] Une grande dame d'avant guerre: Lettres de la princesse Radziwill au général de Robilant, 1889–1914: [en 4 vol.]. – Bologna: Nicola Zanichelli, 1933–1934.

[3] Radziwiłł, M. Briefe von deutschen Kaiserhof 1889–1915. – Berlin, 1936.

амерыканскага каланіяльнага стылю, аб'яданаўшы сельскую ідылічнасць з прыгожай стараанглійскай мэбляй і, можа, нават трошкі гатэльным камфортам[1]. Аднак ужо ў 1915 г. да Паланэчкі наблізіўся фронт Першай сусветнай вайны. У палацы размясціўся штаб 2-й грэнадзёрскай дывізіі Расійскай імператарскай арміі. А ў выніку рэвалюцый 1917 г. і наступных ваенных канфліктаў радзівілаўская сядзіба канчаткова страціла сваё аблічча. Падобны лёс напаткаў Нясвіжскі і Алыцкі замкі, рэстаўрацыя якіх адбывалася ў канцы XIX – пачатку XX стст.

Вяртаючыся да тэмы падарожжаў, трэба адзначыць, што падчас іх Радзівілы вялі дзённікі і дарожныя нататкі. Большасць з іх знаходзіцца ў рукапісным выглядзе ў архівах Польшчы і Чэхіі, але некаторыя былі выдадзены невялікімі накладамі, як напрыклад «Дзесяць дзён у краіне маіх продкаў» Марыі Дароты Радзівіл з Кастэлянаў[2], дзе яна апісвае сваё падарожжа па паўднёвай Францыі.

Адметнае месца ў эга-дакументах Радзівілаў XIX–XX стст. займаюць Нясвіж і Нясвіжскі палац. Гэта быў цэнтр ардынацыі і сапраўдная радзівілаўская сталіца, адраджэнне якой звязана з дзейнасцю Марыі Дароты дэ Кастэлян Радзівіл. У перыяд заняпаду, які доўжыўся да 1870-х гг., палац, «дбайна абраваны ў 1812 годзе»[3], паводле ўспамінаў Марыі Дароты, ператварыўся ў нежылы будынак з дзіравым дахам, у якім дзе-нідзе абрываліся столі, а навакол усё патанала ў неверагоднай гразі[4]. Нягледзячы ні на што ў замку захаваўся архіў з такімі каштоўнымі дакументамі, як акты Гарадзельскай і Люблінскай уній, хоць, як піша Марыя Дарота, ён знаходзіўся ў жахлівым стане і за яго адказываў толькі адзін архівіст, які фізічна не мог апрацаваць такі вялікі збор[5]. Таксама ў

---

1 Radziwiłł, K.-M. Pamiętniki. Od feudalizmu do socjalizmu bezpośrednio. – Warszawa: Wiedza Powszechna, 2000. – S. 45.

2 Radziwiłł, M. Dix Jours à travers le pays de mes ancêtres. – Provence, 1912. – 48 s.

3 Clary-Aldringen, A. Geschichten eines alten Österreichers / A. Clary-Aldringen. – Frankfurt : Ullstein, 1977. – 282 S.

4 Француженка пры прускім двары. Успаміны княгіні Радзівіл з роду Кастэлян, 1840–1873 гг. / падр. да публікацыі В. Быль // Acta anniversaria : зборнік навуковых прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». – Т. 2. – Нясвіж, 2016. – С. 223.

5 Француженка пры прускім двары… С. 226–227.

палацы захоўваліся шматлікія партрэты, як прадстаўнікоў роду Радзівілаў, так і іншых арыстакратычных фамілій Рэчы Паспалітай. Для рэстаўрацыі гэтых карцін Марыя Дарота запрасіла ў Нясвіж мастакоў, некаторыя з якіх таксама займаліся рэстаўрацыяй фрэсак у касцёле Божага Цела[1].

Мастакоў запрашалі і на знакамітыя радзівілаўскія паляванні. Адзін з іх – Юльян Фалат – стаў сапраўдным сябрам сям'і. Упершыню ён прыехаў у Нясвіж у 1886 г., прачытаўшы ў газетах аб тым, што сюды на паляванне збіраецца нямецкі прынц Вільгельм Гогенцолерн (будучы імператар Вільгельм II). Паколькі запрошаны суправаджаць прынца мастак, які меўся рабіць замалёўкі з натуры, не змог прыехаць, Фалат вырашыў заняць яго месца. Яму пашанцавала трапіць на той жа цягнік, на якім ехаў нямецкі прынц, і ў Гарадзеі ён здолеў уручыць свае рэкамендацыйныя лісты князю Мацею Радзівілу (1842–1907) і кіраўніку адміністрацыі Міхаілу Абламовічу, якія сустракалі тут важнага госця. Цягнік прыйшоў на станцыю ў чатыры гадзіны ночы, а тэмпература, паводле згадак Ю. Фалата, была каля 20 градусаў марозу. Паводле ўспамінаў мастака, яго прыезд стаў нечаканым для радзівілаўскай адміністрацыі, кіраўнік якой М. Абламовіч з насцярогай паставіўся да нечаканага візіцёра. Фалату было прапанавана прыехаць у Нясвіжскі палац для далейшай размовы. На маленькай, засыпанай снегам станцыі, асветленай толькі брудна-жоўтым святлом пары ліхтароў, дзяжурылі яўрэі-вазніцы, якія сваім адзеннем больш нагадвалі эскімосаў, адзін з іх і прывёз у сваіх санях замерзлага мастака з Гарадзеі ў Нясвіж:

*«Нарэшце мы заехалі на пагорак, з якога я ўбачыў сваю "Меку": Нясвіжскі замак і мястэчка з вежачкамі касцёлаў.*

*Сярод мора тумана, які расплываўся над ставамі, муры і вежы замка быццам скалы выраcталі перада мной, падсвечаныя цынабровым[2] колерам узыходзячага сонца»*[3].

Малюнкі Ю. Фалата, зробленыя падчас гэтага палявання, прыйшліся даспадобы не толькі Радзівілам, але і нямецкаму прынцу. Створаны

[1] НГАБ. – Ф. 694. Воп. 2. Спр. 5559. Арк. 135 – Рахунак за рэстаўрацыю 8 партрэтаў з Нясвіжскага палаца, якія былі адрэстаўраваны мастаком Г.-В. Гуміньскім.

[2] Цынабровы або кітайскі чырвоны – адценне чырвона-аранжвага колеру.

[3] Fałat, J. Pamiętniki. – Katowice, 1987. – S. 139–143

ім партрэт Вільгельма ў вобразе паляўнічага з башлыкам на галаве стаў адной з любімых карцін будучага імператара[1]. Дзякуючы гэтаму ў наступныя дзесяць гадоў мастак маляваў усе паляванні Вільгельма II у яго паляўнічай рэзідэнцыі Хубертусшток. З Радзівіламі ў яго склаліся прыязныя адносіны, што адлюстравана як у мемуарах мастака, так і ў радзівілаўскіх лістах. Асабліва прывязаліся да мастака дзеці Антонія Вільгельма і Марыі Дароты. Ліст малодшага з іх Станіслава Вільгельма адрасаваны Фалату (18 лютага 1891 г.) мы прыводзім у скарачэнні.

*«Шаноўны спадар!*

*Прашу прабачэння за тое, што не змог напісаць Пану раней, урэшце рэшт у мяне з'явілася магчымасць трохі сплаціць свой доўг у лістах.*

*Моцна злуюся на цябе, што ты не прыязджаеш да нас. Сёння імяніны Алены (старэйшая сястра Станіслава –* **У. К.***). Я катаюся на конях і цудоўна праводжу час.*

*Абдымаю ад усяго сэрца!*

*Стась»*[2].

З часам Юльян Фалат стаў надзвычай папулярным мастаком, але магчымасць маляваць, паляваць і жыць у лясных будах радзівілаўскіх уладанняў ён да канца жыцця цаніў больш за вольны доступ у берлінскія салоны. У Нясвіжы яго творчай майстэрняй стала вежа над уязной брамай палаца. Трэба адзначыць, што, наведваючы Нясвіж, ён браў не толькі фарбы і пэндзлі, але і фотаапарат, а яго здымкі з'яўляюцца найбольш раннімі з вядомых фотаздымкаў Нясвіжскага палацава-паркавага ансамбля.

Апісываючы інтэр'еры палаца, Ю. Фалат звяртае ўвагу на кабінет кіраўніка радзівілаўскага адміністрацыі М. Абламовіча:

*«Вялікі квадратны пакой, з двумя вялікімі скіраванымі на поўнач вокнамі, праз якія тым не менш з-за вялікіх валоў трапляе няшмат святла, выглядае як рэзідэнцыя паляўнічага, аб гэтым сведчаць скуры мядзведзяў, рогі ласёў, паляўнічыя прылады на сценах і на стале. У агромістым каміне палаюць сапраўдныя бярвенні»*[3].

[1] Француженка пры прускім двары…. С. 226.

[2] Aleksandrowicz, M. Fałat znany i nieznany. T. 1 Korespondencja z lat 1874–1895, Bielsko-Biała, 2003. – S. 176.

[3] Fałat, J. Pamiętniki... s. 143–144.

У 1913–1914 гг. Нясвіж наведваў Крыштаф Мікалай Радзівіл, а ў 1914–1915 гг. – Марыя Малгажата Патоцкая з Радзівілаў. Апісываючы ў сваіх успамінах палац, яны ў асноўным гавораць пра шпіталь, які пачаў тут дзейнічаць у першыя дні сусветнай вайны. Так, Крыштаф Мікалай, які бачыў палац падчас знакамітага радзівілаўскага з'езду 1913 г., асабліва падкрэсліў змены, што адбыліся ўсяго праз год, калі ў рэпрэзентацыйнай частцы палацу быў створаны шпіталь, дзе працавалі сёстрамі міласэрнасці і дапамагалі параненым жанчыны – прадстаўніцы роду Радзівілаў, у тым ліку і жонка Антонія Альбрэхта Дораці Дзікан. Як успамінае Крыштаф Мікалай Радзівіл, у гэты час гаспадар палаца быў ужо напалову паралізаваны і мог перасоўвацца толькі ў інвалідным крэсле, што стала адной з прычын таго, што маладая і надзвычай прыгожая амерыканка страціла цікавасць да мужа і Нясвіжа[1].

Падчас Першай сусветнай вайны ў старадаўнім палацы апынулася так шмат гасцей (прадстаўнікоў роду Радзівілаў і іншых асоб), што, нягледзячы на памеры будынка, іх цяжка было размясціць. Таму некаторыя пакоі былі падзелены для стварэння асобных спальняў, як, напрыклад, цэнтральная зала палацу, якая сёння адноўлена як Залатая. Зброя, што знаходзілася тут на пачатку XX ст., была разам з іншымі каштоўнасцямі вывезена далей ад лініі фронту. Залу падзялілі скразнымі калідорамі на чатыры часткі, адну з якіх займала якраз Марыя Малгажата Патоцкая, а другую – яе дзеці[2].

Падсумоўваючы, трэба адзначыць, што ў артыкуле дадзены толькі кароткі агляд эга-дакументаў Радзівілаў адзначанага часу. Большая частка збораў дагэтуль знаходзіцца ў неапрацаваным стане ў архівах Польшчы, Беларусі, Літвы, Германіі і Чэхіі і не стала аб'ектам належнай увагі з боку даследчыкаў. Між тым вывучэнне эга-дакументаў дазваляе раскрыць унутрысямейныя ўзаемаадносіны, асабістыя перакананні прадстаўнікоў роду і сістэму каштоўнасцяў Радзівілаў XIX – пачатку XX стст.

---

[1] Radziwiłł, K.-M. Pamiętniki. Od feudalizmu do socjalizmu bezpośrednio. – Warszawa: Wiedza Powszechna, 2000. – S. 44.

[2] Potocka, M. (Maria Małgorzata z Radziwiłłów-Franciszkowa Potocka). Z moich wspomnień (pamiętnik). – London: Veritas, 1983. – S. 202.